# Я ЎМЕЮ ДУМАЦЬ І ФАНТАЗІРАВАЦЬ





# Я ЎМЕЮ ДУМАЦЬ І ФАНТАЗІРАВАЦЬ



HARVEST
МІНСК

УДК 37.018.1-053.4
ББК 74.92
Я11

*Пераклад з рускай мовы: Міраслаў Вячаслававіч Адамчык*

Я11 **Я ўмею думаць і фантазіраваць.** — Мінск : Харвест, 2018. — 64 с. : іл.

ISBN 978-985-18-4190-1.

Ваша дзіця падрасце, і вы, зразумела, захочаце, каб яно развівалася правільна? Тады вам тэрмінова трыба купіць гэта выданне – яркія карцінкі і даступная перадача матэрыялу зробяць яго настольнаю кнігаю малыша.

Прачытаўшы яе, дзіця:

— вывучыць літары;

— паспрабуе чытаць па складах;

— пазнаёміцца з лічбамі ды лікамі;

— засвоіць азы лічэння.

**УДК 37.018.1-053.4**
**ББК 74.92**

**ISBN 978-985-18-4190-1**

© Падрыхтоўка і афармленне.
ТАА «Харвест», 2017

# ФОРМА І КОЛЕР





КРУГ









Усё, што ты бачыш на старонцы, мае круглую форму — форму кола. Звярні ўвагу — у кола няма аніводнага вугла.















Усе гэтыя прадметы маюць квадратную форму. У квадрата чатыры вуглы, і ўсе яго бакі роўныя — то бок аднолькавыя.



ТРОХВУГОЛЬНІК









Прадметы, намаляваныя на гэтай старонцы, трохвугольнай формы. У трохвугольніка толькі тры вуглы.

# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ





КРЫЖ

ПРАМАВУГОЛЬНІК

СТРЭЛКА





СЭРЦА

На гэтых старонках ты пазнаёмішся з больш складанымі формамі. Уважліва вывучы іх і паспрабуй запомніць.

# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ

ТРАПЕЦЫЯ



ЗОРКА





РОМБ

ПЯЦІВУГОЛЬНІК



АВАЛ



# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ





Якія фігуры намаляваныя на гэтай старонцы?

Назаві кожную фігуру, абвядзі яе па пункціры, а потым расфарбуй каляровымі алоўкамі.



Уважліва разгледзь прадметы на гэтым малюнку і скажы, якую форму яны нагадваюць.

# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ











Якога колеру прадметы на гэтай старонцы? Правільна — СІНЯГА. Якія прадметы сіняга колеру атачаюць цябе цяпер? Расфарбуй васьмінога сінім алоўкам.

# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ



Якога колеру прадметы на гэтай старонцы? Правільна — ЖОЎТАГА. Якія яшчэ прадметы жоўтага колеру ты ведаеш? Расфарбуй месяц жоўтым алоўкам.

# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ



Разгледзь прадметы на старонцы. Якога яны колеру? Правільна — ЧЫРВОНАГА. Якая вопратка чырвонага колеру ў цябе ёсць? Расфарбуй зорку чырвоным алоўкам.











Якога колеру прадметы на гэтай старонцы? Правільна — ЗЯЛЁНАГА. Што яшчэ ў прыродзе мае зялёны колер? Расфарбуй вусеня зялёным алоўкам.

# РАЗВІВАЕМ УСПРЫМАННЕ

ЗЯЛЁНЫ





ЖОЎТЫ





ЧЫРВОНЫ

СІНІ

Разгледзь малюнкі. Што ты на іх бачыш? Пакажы на кожным малюнку прадметы зададзенага колеру.



Разгледзь кашулі ў шафе. Скажы, якога яны колеру.



Знайдзі для кожнай кашулі вешалку адпаведнага колеру.



Разгледзь уважліва малюнак. Расфарбуй усе круглыя прадметы жоўтым колерам, трохвугольныя — чырвоным, квадратныя — зялёным, прамавугольныя — карычневым, а зоркі зрабі сінімі.
















Разгледзь прыведзеныя тут прадметы. Скажы, якой яны формы і колеру. А можа, яны складаюцца адразу з некалькіх формаў і колераў? Назаві іх усе.

# ЯКАСЦІ ПРАДМЕТАЎ





МАЛЕНЬКАЯ
ЛЯЛЬКА

МАЛЕНЬКІ
МЯДЗВЕДЗІК





ВЯЛІКАЯ
ЛЯЛЬКА



ВЯЛІКІ МЯДЗВЕДЗІК

МАЛЕНЬКАЯ
МАШЫНКА



ВЯЛІКАЯ
МАШЫНКА

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



ВЫСОКІ ХЛОПЧЫК



НІЗКІ ХЛОПЧЫК

НІЗКАЯ ВАЗА





ВЫСОКАЯ ВАЗА

ВЫСОКАЕ ДРЭВА





НІЗКАЕ ДРЭВА

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



Пакажы на малюнку ўверсе спачатку вялікія мячыкі, а потым — маленькія.



Якая з дзвюх дзяўчатак вышэйшая, а якая — ніжэйшая?

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ

Разгледзь малюнкі на гэтай старонцы. Кожны з іх мае пару. Адзін прадмет у пары вялікі, а другі — маленькі. Пакажы, дзе які.







# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ

Уважліва разгледзь малюнкі. Кожны з іх мае пару. Адзін прадмет у пары высокі, а другі — нізкі. Пакажы, дзе які.







# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



Уважліва разгледзь малюнак. Хто на ім намаляваны? Пакажы спачатку ўсіх пінгвінаў, якія плывуць уверх, а пасля — тых, што плывуць уніз.

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



ВУЗКІ

ПОЎНЫ





ШЫРОКІ

ПУСТЫ






ДОЎГІ

КАРОТКІ



# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ

ПАВОЛЬНЫ





ХУТКІ



СУМНЫ

ДОБРЫ





ЗЛОСНЫ



ВЯСЁЛЫ

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ





БРУДНЫ

ЧЫСТЫ

ЦЯЖКІ

ЛЁГКІ







АДНОЛЬКАВЫ

РОЗНЫ

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ

ГАРАЧЫ



ХАЛОДНЫ







СЛАБЫ

МОЦНЫ



МОКРЫ

СУХІ

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



БЕДНЫ …

ВОСТРЫ



…

ПУХНАТЫ





…

Уважліва разгледзь малюнкі. Што ты на іх бачыш? Назаві для кожнай парнай ілюстрацыі яе процілеглае значэнне.

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



УВЕРХ ...



СВЕТЛА



ЗАЧЫНЕНА





... ...

# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ

Уважліва разгледзь малюнак і адкажы на пытанні.

Што намалявана на малюнку? Што трымаюць ваверкі ў лапках? Каторая з вавёрак большая: тая, што сядзіць злева альбо справа? Што вышэйшае: дрэвы ці кусты? Якое дрэва самае высокае, а якое — самае нізкае? Знайдзі самы вялікі і самы маленькі жолуд. Пакажы на плоце кароткія і доўгія жэрдачкі.



# ПАРАЎНОЎВАЕМ І ВЫБІРАЕМ



Пакажы самую доўгую гірлянду і самую кароткую.



Знайдзі сярод алоўкаў самы доўгі і самы кароткі.

# ПАМЯЦЬ, УВАГА, ЛОГІКА





Уважліва разгледзь малюнкі на гэтай старонцы. Якія жывёлы тут намаляваныя? Пастарайся запомніць гэтых звяроў. Пасля загарні кніжку і пералічы ўсіх жывёл па памяці.

# Вучымся мысліць






Якія жывёлы намаляваныя на малюнках уверсе? А якія літары ты бачыш каля кожнай з іх? Пастарайся запомніць, побач з якой жывёлкай стаіць пэўная літара. Пасля гэтага захіні верхнюю частку старонкі аркушам паперы і паспрабуй прыгадаць, якая літара была пазначана каля кожнай жывёлкі.

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Уважліва разгледзь малюнак. Пастарайся запомніць, хто на чым грае. Загарні кніжку і пералічы ўсіх жывёлак ды іхнія музычныя інструменты.

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ





Уважліва разгледзь малюнкі. Што на іх намалявана? Што агульнага паміж гэтымі малюнкамі? А чым яны адрозніваюцца? Знайдзі як мага болей адрозненняў паміж выявамі.



Дапамажы мышанятку сабраць усе схаваныя пад зямлёй прадметы. Для гэтага знайдзі патрэбны шлях і пры дапамозе каляровых алоўкаў правядзі лініі ад мышаняці да кожнага прадмета.

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Знайдзі і пакажы ўсе пары пантофляў. Для якой пантофлі не знайшлося пары?

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Знайдзі і пакажы цень кожнага савянятка.

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Уважліва разгледзь малюнкі на гэтай старонцы. Хто на іх намаляваны? Знайдзі і пакажы такіх самых рыбак на малюнку з суседняй старонкі. Якіх рыбак не знайшлося на малюнку?



# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ





Уважліва разгледзь малюнкі. Што на іх намалявана? Чым падобныя гэтыя малюнкі, а чым яны адрозніваюцца? Знайдзі і пакажы ўсе адрозненні.



Уважліва разгледзь малюнкі. Якія памылкі зрабіў мастак на кожным з іх?





Як адным-двума словамі можна назваць кожную групу прадметаў? Знайдзі ў рамачках па адным лішнім прадмеце. Чаму ты выбраў менавіта іх?



Уважліва разгледзь малюнак. Як мяркуеш, куды едзе гэта сям'я? Што лішняе яны ўзялі з сабой для адпачынку на прыродзе? Чаму ты так лічыш?

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Якія прадметы намаляваныя на гэтай старонцы? Што паміж імі агульнага? А чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго? Якія віды транспарту прызначаныя для перамяшчэння па вадзе? А па паветры? Які транспарт прызначаны для перавозкі груза?

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Разгледзь малюнак. Што на ім намалявана? Якія памылкі зрабіў мастак на гэтым малюнку?

# ВУЧЫМСЯ МЫСЛІЦЬ



Уважліва разгледзь малюнкі. Што на іх намалявана? Як ты думаеш, што было спачатку, а што — потым? Пастаў малюнкі ў патрэбнай паслядоўнасці.

# ДРОБНАЯ МАТОРЫКА



Што намалявана на гэтым малюнку? Дапамажы пірату аднесці скарбы на карабель. Для гэтага знайдзі правільны маршрут і пазнач яго лініяй пры дапамозе алоўка.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Абвядзі контуры паводле ўзору: спачатку па пункцірных лініях, а потым па суцэльных. Пры гэтым старайся не адрываць аловак ад паперы.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Што намалявана на гэтай старонцы? Колькі шарыкаў ты бачыш? Намалюй шарыкі па пункцірных лініях, а потым расфарбуй іх паводле ўзору.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Якія прадметы ты бачыш на гэтай старонцы? Якіх дэталяў ім бракуе? Акуратна дамалюй элементы, якіх нестае, і расфарбуй малюнкі.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Што намалявана на гэтай старонцы? Якога колеру павінен быць снегавічок? А астатнія элементы малюнку? Акуратна расфарбуй іх алоўкамі адпаведных колераў.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Акуратна зафарбуй кожную частку малюнка алоўкам указанага колеру. Якая жывёла ў цябе атрымалася? Прыдумай гэтаму сабаку мянушку.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ





Намалюй грыбок па клетачках. Як завецца такі грыб? Расфарбуй яго алоўкамі патрэбных колераў.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Дапамажы зайчыку і куранятку пафарбаваць велікодныя яйкі паводле ўзору. Уважліва расфарбоўвай усе дэталі малюнкаў, не выходзячы за іх абрысы.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ




Паслядоўна злучы ўсе кропкі малюнка, пачынаючы ад лічбы 1. Якая жывёла ў цябе атрымалася? Прыдумай сабачку імя. Акуратна расфарбуй малюнак.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Пры дапамозе пальчыкаў, акунутых у фарбу, можна атрымаць каляровыя плямкі.





Ваня збірае ягады. Як яны называюцца? А якія ягады ты яшчэ ведаеш? Дакраніся пальчыкам з фарбай да кожнай ягадкі, намаляванай унізе старонкі.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



А ты ведаеш, што маляваць можна з дапамогай штампа? У якасці штампа можна выкарыстоўваць драўляныя фігуркі, коркі (пробкі), сцірку і да г.п. Паспрабуй — будзе весела!





Дапамажы зайку ўпрыгожыць ручнік з дапамогай штампаў.

# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Дамалюй промнікі сонейку, каб яно ярчэй свяціла.





Дамалюй падаючыя кроплі, каб убачыць, як ідзе дожджык.

Правядзі нітачкі ад рук клоўна да паветраных шарыкаў, каб яны не адляцелі.



# ТРЭНІРУЕМ ПАЛЬЧЫКІ



Абвядзі па контуры мячык і расфарбуй яго паводле аднаго з узораў. Якія яшчэ прадметы круглай формы ты ведаеш?





Зрабі гэтую елку святочнай — намалюй на ёй рознакаляровыя шарыкі.

# ЛЕПІМ З САЛЁНАГА ЦЕСТА ПЕЎНІКА



**Табе спатрэбяцца:**
- цеста;
- качалка;
- стэка;
- пэндзлік;
- шкляначка з вадой;
- гуаш жоўтага, чырвонага, аранжавага, зялёнага, сіняга, белага і чорнага колераў.

**Этапы працы**

1. Раскачай цеста ў пласт.

2. Стэкай намалюй на ім пеўніка.

1



2



3



3. Выражы выраб па контуры, прыбяры лішняе цеста і пастаў выраб высыхаць у духоўку.

4. Выраб, які высах і астыў, расфарбуй. Тулава пеўніка зафарбуй жоўтым колерам. Грабянёк і бародку — чырвоным, а дзюбку і лапы — аранжавым. Пёркі і крыло — сінім, зялёным, аранжавым і чырвоным колерамі. Вочкі — белым і чорным. Дай фарбе крыху падсохнуць. Пеўнік гатовы!

4



# ЛЕПІМ З САЛЁНАГА ЦЕСТА ПІНГВІНА



**Табе спатрэбяцца:**

- цеста;
- качалка;
- стэка;
- пэндзлік;
- шкляначка з вадой;
- гуаш белага, чорнага і аранжавага колераў.

**Этапы працы**

1. Раскачай качалкай цеста ў пласт.

1



2



3



2. Стэкай намалюй на ім пінгвіна.

3. Выражы выраб па контуры, прыбяры лішняе цеста і пастаў выраб высыхаць у духоўку.

4



4. Выраб, які высах і астыў, расфарбуй. Белым колерам зафарбуй жывоцік і пыску пінгвіна. Чорным — галаву, крылкі і бакі. Аранжавым расфарбуй носік і лапкі. Чорным намалюй вочкі і бровы. Дай фарбе трошкі падсохнуць. Пінгвін гатовы!

# ЛЕПІМ З САЛЁНАГА ЦЕСТА ВЕРТАЛЁТ



**Табе спатрэбяцца:**
- цеста;
- качалка;
- стэка;
- пэндзлік;
- шкляначка з вадой;
- гуаш белага, жоўтага, сіняга, чырвонага і чорнага колераў.

**Этапы працы**

1. Раскачай качалкай цеста.



2. Стэкай намалюй на ім верталёт.



3. Выражы выраб па контуры, прыбяры лішняе цеста і пастаў выраб высыхаць у духоўку.



4. Калі выраб высахне і астыне, расфарбуй яго. Колы і роцік расфарбуй чырвоным колерам, а вочкі — чорным. Вінты зафарбуй жоўтым колерам, а шкло — белым. Дай фарбе крышку падсохнуць. Верталёт гатовы!



www.harvest.minsk.by

ЕАС

*Выданне для вольнага часу*

# Я ЎМЕЮ ДУМАЦЬ І ФАНТАЗІРАВАЦЬ

*ДЛЯ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ*
*ДЛЯ ЧЫТАННЯ ДАРОСЛЫМІ ДЗЕЦЯМ*

0+

Пераклад з рускай мовы: *М. В. Адамчык*
Адказная за выданне *В. Н. Волкава*
Падпісана да друку 14.11.2017 г.
Фармат 60x90/8. Папера афсетная. Друк афсетны. Умоў. друк. арк. 2,0.
Наклад 1000 асобнікаў. Замова 3112.

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Рэспубліка Беларусь, 220073, г. Мінск, вул. Скрыганава, д. 4А, адм. пам. 39.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by
Наш сайт: www.harvest.minsk.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь.





Форма і колер

Якасці прадметаў

Памяць, увага, логіка

Дробная маторыка





ВАША ДЗІЦЯ ПАДРАСЦЕ, І ВЫ, ЗРАЗУМЕЛА, ЗАХОЧАЦЕ, КАБ ЯНО РАЗВІВАЛАСЯ ПРАВІЛЬНА? ТАДЫ ВАМ ТЭРМІНОВА ТРЭБА КУПІЦЬ ГЭТА ВЫДАННЕ – ЯРКІЯ КАРЦІНКІ І ДАСТУПНАЯ ПЕРАДАЧА МАТЭРЫЯЛУ ЗРОБЯЦЬ ЯГО НАСТОЛЬНАЮ КНІГАЮ МАЛЫША.

ПРАЧЫТАЎШЫ ЯЕ, ДЗІЦЯ:

- ПАЗНАЁМІЦЦА З ТАКІМІ ПАНЯТКАМІ, ЯК ФОРМА І КОЛЕР
- ДАВЕДАЕЦЦА ПРА ЯКАСЦІ ПРАДМЕТАЎ
- РАЗАЎЕ ПАМЯЦЬ, УВАГУ І ЛОГІКУ
- ПАПРАКТЫКУЕЦЦА Ў ДРОБНАЙ МАТОРЫЦЫ

www.harvest.minsk.by
HARVEST
ISBN 978-985-18-4190-1
9 789851 841901
ЕАС

Я ЎМЕЮ ДУМАЦЬ І ФАНТАЗІРАВАЦЬ